# Нашы юбіляры

## ПАВЕЛ УЛАДЗІМІРАВІЧ СЦЯЦКО



Споўнілася шэсцьдзесят гадоў члену нашай рэдкалегіі, вядомаму беларускаму мовазнаўцу і педагогу, доктару філалагічных навук, прафесару, выдатніку народнай асветы БССР, ветэрану працы, загадчыку кафедры агульнага і руска-славянскага мовазнаўства Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны Паўлу Уладзіміравічу Сцяцко. Нарадзіўся ён 5 сакавіка 1930 года ў вёсцы Грабава Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля сямігодкі вучыўся ў Ваўкавыскім педвучылішчы. Скончыўшы яго на «выдатна», адразу ж паступіў у Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут на фізіка-матэматычны факультэт. Але юнака больш вабіла філалогія, і ён хутка перайшоў на факультэт мовы і літаратуры. Ужо з другога курса актыўна ўключыўся ў збіранне і апрацоўку матэрыялаў для Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы, што і вызначыла кірунак яго далейшых навуковых інтарэсаў. Скончыў у 1953 годзе інстытут з адзнакай і быў пакінуты для працы на кафедры беларускай мовы і літаратуры, затым выбіраўся старшым выкладчыкам кафедры беларускай і рускай моў. Экстэрнам здаў кандыдацкія экзамены і ў 1961 годзе быў залічаны ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Праз паўтара года абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную лексіка-семантычнай сістэме народных гаворак Зэльвеншчыны, і працаваў старшым выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам на кафедры беларускай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Тут жа падрыхтаваў і ў 1980 годзе абараніў доктарскую дысертацыю аб субстантыўным беларускім словаўтварэнні. З ліпеня 1981 года працуе ў Гомельскім універсітэце.

Аб'ектамі навуковых даследаванняў П. У. Сцяцко з'яўляюцца лексікалогія, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія і сінтаксіс беларускай мовы, беларуская дыялекталогія, словаўтваральныя сувязі славянскіх моў, мова беларускіх мастацкіх твораў, методыка выкладання беларускай і рускай моў у вышэйшых навучальных установах. Вынікі сваіх навуковых пошукаў ім выкладзены ў кнігах «Народная лексіка» (1970), «Дыялектны слоўнік: З гаворак Зэльвеншчыны» (1970), «Народная лексіка і словаўтварэнне» (1972), «Беларускае народнае словаўтварэнне» (1977) і ў шматлікіх артыкулах. Ён жа сааўтар акадэмічнай «Беларускай граматыкі», ч. 1 (1985), сааўтар і сарэдактар лексікаграфічных прац «Русско-белорусский словарь лингвистических терминов» (1988) і «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» (1990).

П. У. Сцяцко многа ўвагі ўдзяляў і ўдзяляе стварэнню навукова-метадычнай літаратуры. Ён сааўтар дапаможнікаў «Беларуская мова» для сярэдніх навучальных устаноў (1970) і для педагагічных вучылішчаў (1982), вучэбных дапаможнікаў для філалагічных факультэтаў педінстытутаў «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» (1969; 3-е выд., 1987), «Сучасная беларуская мова. Марфалогія» (1975), «Сучасная беларуская мова. Фанетыка, арфаграфія, лексікалогія» (1976), «Аналіз слова, словазлучэння, сказа» (1977), «Лингвистическая терминология в вузовских курсах» (1984). Усяго ж на рахунку юбіляра звыш 150 друкаваных навуковых прац. Імя яго як рэцэнзента або рэдактара значыцца на тытульных лістах многіх манаграфій па анамастыцы, граматыцы, лексікалогіі, падручнікаў па беларускай і рускай мовах. З навуковымі дакладамі

і паведамленнямі Павел Уладзіміравіч выступаў на IX Міжнародным з'ездзе славістаў, на міжнародным сімпозіуме «Беларуска-польскія ізалексы», на 7 усесаюзных і 16 рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях.

Плённа займаючыся даследчай працай, П. У. Сцяцко ўвесь час клапоціцца аб падрыхтоўцы навуковых кадраў. Пяць яго аспірантаў паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Часта ён выступае афіцыйным апанентам на абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Разам з плённай даследчай і вучэбнай работай П. У. Сцяцко вядзе і значную грамадскую работу як член рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ імя У. І. Леніна» (4 серыя), рэспубліканскага навуковага міжведамаснага штогодніка «Русский язык», член каардынацыйнага савета «Мовазнаўства» АН БССР.

Высокакваліфікаваны вучоны-мовазнавец, выдатны выкладчык, просты і добразычлівы чалавек, Павел Уладзіміравіч Сцяцко карыстаецца вялікай павагай у калектыве, дзе працуе. Калегі, шматлікія вучні і сябры віншуюць яго з юбілеем, жадаюць яму добрага здароўя, далейшых творчых здзяйсненняў і асабістага шчасця.

**І. К. Германовіч**

## ЛЕАНІД ІВАНАВІЧ БУРАК



Споўнілася 60 гадоў Леаніду Іванавічу Бураку — вядомаму беларускаму савецкаму моваведу, доктару філалагічных навук, прафесару кафедры беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Нарадзіўся ён 23 сакавіка 1930 года ў вёсцы Кульшыно на Вілейшчыне ў сялянскай сям'і. Вучобу ў школе перарвала вайна. І хоць нялёгка было потым наганяць, але школу ён скончыў у 1948 годзе з сярэбраным медалём.

З 1 верасня 1948 года Леанід — студэнт філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Пяць гадоў прамільгнулі хутка. Дасціпнага і руплівага студэнта ўжо тады вылучалі як аднакурснікі, так і выкладчыкі факультэта. Таму і не дзіўна, што ўвосень 1953 года ў Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР з'явіўся новы аспірант — Леанід Бурак. У 1958 годзе ён паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю «Складаназлучаныя сказы ў сучаснай беларускай мове». Гэтая праца засведчыла, што ў беларускае мовазнаўства прыйшоў удумлівы і сур'ёзны даследчык роднай мовы. На працягу дзесяці гадоў (1956—1966) ён працуе спачатку малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам сектара сучаснай беларускай мовы. Супрацоўнікі сектара ў гэты час выдаюць такія фундаментальныя работы, як «Граматыка беларускай мовы» (1962—1966) у двух тамах і «Курс сучаснай беларускай мовы» у трох частках (1957—1961). У гэтых акадэмічных выданнях Л. І. Бураку належыць шэраг важных раздзелаў агульным памерам больш як 30 друкаваных аркушаў.

З верасня 1966 года Л. І. Бурак працуе на кафедры беларускай мовы БДУ імя У. І. Леніна. Гады працы ў Белдзяржуніверсітэце сталі для вучонага асабліва плённымі. Ён распрацаваў і чытае курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы, спецкурс па беларускай пунктуацыі, вядзе спецсемінар па актуальных праблемах сучаснага сінтаксісу. Сотні выпускнікоў факультэта ўдзячны яму і як навуковаму кіраўніку і кансультанту курсавых і дыпломных работ, дакладаў і паведамленняў на студэнцкіх навуковых канферэнцыях.

Гады працы ва універсітэце прынеслі Л. І. Бураку значныя навуковыя здабыткі. У 1979 годзе ён паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Далучэнне ў сучаснай беларускай мове». Адна за другой выходзяць яго кнігі: манаграфіі і вучэбныя дапаможнікі «Сучасная беларуская мова» (1974); «Далучэнне ў сучаснай беларускай мове» (1975); «Зборнік практыкаванняў па сучаснай беларускай мове. Сінтаксіс і пунктуацыя» (1970); «Даведнік па пунктуацыі беларускай мовы» (1980); «Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі» (1989) (у сааўтарстве) і інш. Кнігі і дапаможнікі Л. І. Бурака сталі абавязковай праграмнай літаратурай у курсе сучаснай беларускай літаратурнай мовы для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў БССР. Многія з іх неаднаразова перавыдаваліся, як, напрыклад, «Пунктуацыя беларускай мовы. Дапаможнік для настаўнікаў і студэнтаў», якая нядаўна выйшла трэцім выданнем. Акрамя таго, ім напісана некалькі дзесяткаў мовазнаўчых артыкулаў для «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», «Кароткай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі»; навуковыя артыкулы Л. І. Бурака пастаянна змяшчаюцца ў «Весніку БДУ», зборніках «Беларуская мова», «Русский язык», часопісе «Народная асвета», у рэспубліканскім перыядычным друку. Ён з'яўляецца адным з аўтараў буйнейшага ў беларускім мовазнаўстве нарматыўнага «Слоўніка беларускай